# РЭЖЫМ САНАЦЫІ Ў ДРУГОЙ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

А. Я. Арэх

Навуковы кіраўнік: В. М. Лянцэвіч, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

З падпісаннем Рыжска мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. адбываецца падзел беларусскіх зямель, і да 1939 г. Заходняя Беларусь апынецца пад польскай ўладай. Па гістарычных крыніцах мы ведаем, што з 1926 па 1939 гг. урад Другой Рэчы Паспалітай праводзіў палітыку санацыі, але гэты рэжым застаецца маладаследаваным. Вядома, санацыйная палітыка праводзілася і на заходнебеларускіх землях, таму неабходна больш дасканалае вывучэнне таго, што ўвогуле сабой прадстаўляе рэжым санацыі, яго прычыны, дзейнасць і інш.

Пасля Першай сусветнай вайны ў 1918 г. польскі народ уздымае Вялікапольскае паўстанне, якое ўяўляла сабой узброены супраціў польскага народа, незадаволеннага нямецкай акупацыяй на працягу 123 гадоў. Яно скончылася 28 чэрвеня 1919 г. падпісаннем Версальскага мірнага дагавора, па якому Рэспубліка Польшча набыла тэрыторыі, што лічыліся "калыскай польскай дзяржаўнасці" на паўночна-заходнім і заходнім напрамках [1]. З набыццём гэтых тэрыторый пачынаецца адраджэнне Рэчы Паспалітай у межах 1795 г. Так, існавала два шляхі ўключэння тэрыторый сучаснай Беларусі і Украіны ў склад польскай дзяржавы. Урад на чале з Ю. Пілсудскім, сфарміраваны ў 1926 г., прапанаваў ідэю федэратыўнага ўладкавання тэрыторыі Рэспублікі Польшчы, якое прадугледжвала аб'яднанне зямель Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны ў федэрацыю ў процівагу Савецкай Расіі (далей – РСФСР). Таксама існавала канцэпцыя інкарпарыравання вышэйзгаданых тэрыторый у склад Польскай дзяржавы, прыхільнікам якой выступала партыя Нацыянальнай дэмакратыі. Гэты шлях узбуйнення тэрыторыі Польшчы прадугледжваў паступовае ўключэнне ўсходніх зямель, Вільні і Львова, а потым каланізацыю беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў, якія складалі асноўную частку насельніцтва гэтых абласцей [2, с. 412].

У выніку савецка-польскай вайны, якая скончылася падпісаннем 18 сакавіка 1921г. Рыжскага мірнага дагавора, да Польшчы былі далучаны землі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Трэба адзначыць, что бакамі ў гэтым дагаворы выступалі РСФСР і Савецкая Украіна за аднаго боку, а з другога – Рэспубліка Польшча. Такім чынам, усе паўнамоцтвы адносна вырашэння лёсу Савецкай Беларусі (далей – ССРБ) належалі РСФСР, а меркаванні прадстаўнікоў ССРБ не адыгралі пэўнай ролі пры падзеле беларускіх тэрыторый. З гэтага часу амаль палова беларускага насельніцтва і тэрыторыі апынулася ў складзе Польшчы.

Нельга разглядаць гісторыю Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. у адрыве ад палітычных працэсаў, якія адбываліся ў Другой Рэчы Паспалітай у міжваенны перыяд. У выніку травеньскага пераварота 1926 г., што ўзначальваў

Ю. Пілсудскі, “санацыйны” ўрад стварае ўласную палітычную партыю – Беспартыйны блок [2, с. 435]. Падчас выбараў на пасаду прэзідэнта Юзэф Пілсудскі, абраны Польскім соймам, не жадаючы быць абмежаваным ва ўладных паўнамоцтвах, самаўхіляецца і пакідае сабе пасаду міністра абароны, а на пасаду прэзідэнта рэкамендуе аднадумца І. Масціцкага. Лічыцца, што фактычна з 1926 г. Пілсудскі ўсталёўвае дыктатуру, якая працягнецца да 1935 г., а жыхары Заходніх Беларусі і Украіны апынуцца ва ўмовах рэжыму санацыі [3]. Але трэба адзначыць, пры ўсёй аўтарытарнасці ў II Рэчы Паспалітай дзейнічае інстытут шматпартыйнасці (напрыклад, “Стронництво народове”, Хрысціянская дэмакратыя, Камуністычная партыя Польшчы і інш.), таксама дзейнічалі партыі нацыянальных меншасцяў, у тым ліку беларускія. Безумоўна, большая частка парламенцкіх мандатаў належала палякам, і толькі невялікай колькасцю валодалі нацыянальныя меншасці, да якіх адносіліся беларусы [2, с. 433]. Таму можна сказаць, што ў міжваенны перяд у II Рэчы Паспалітай усталяваўся аўтарытарны рэжым, які з ходам часу імкнуўся да дэмакратычнага.

Што сабой уяўляў рэжым санацыі? Першая сусветная і польска-савецкая войны, паўстанне ў Вялікай Польшчы і інш. падзеі істотна паўплывалі на сацыяльнае, палітычнае і эканамічнае становішча дзяржавы. Так, у выніку Вялікапольскага паўстання, якое праходзіла пад лозунгам “маральнай санацыі” польскага грамадства, пачынае разгортвацца аднаіменная палітыка. Тэрмін “санацыя” мае лацінскае паходжане і перакладаецца як “аздараўленне”. Паўстае пытанне: каго або што трэба было аздараўляць? З прычыны таго, што санацыйную палітыку звязываюць з асобай Ю. Пілсудскага, трэба адзначыць яго нелюбоў да карупцыі, якая існавала ў Польшчы ў часы манархіі. Таму першапачатковай мэтай гэтай палітыкі было пазбаўленне ад рудымента, уласцівага манархіі, і вырашэнне эканамічных пытанняў. Такім чынам, палітыка санацыі ў першасным сэнсе – гэта сукупнасць мер па “аздараўленню” экономікі II Рэчы Паспалітай, якія выкарыстоўваў польскі ўрад у перыяд з траўня 1926 па 1939 гг. [3].

У нацыянальных рэгіёнах, да якіх можна аднесці і тэрыторыю Заходняй Беларусі, урад падчас ажыцяўлення палітыкі санацыі у якасці рухаючай сілы бачыў моладзь [4, с. 8]. Каб развіваць экономіку, трэба было ўзняць узровень адукацыі насельніцтва, таму галоўнае месца адводзілася народным сельскагаспадарчым школам. Арганізацыю вясковых (павятовых) школ лёгка растлумачыць, бо большасць насельніцтва складала моладзь ад 14 да 24-25 гадоў, а колькасць вясковых жыхароў значна перавышала колькасць людзей, якія пражывалі у гарадах (80-85% і 15-20% сельскае і гарадское насельніцтва адпаведна) [4, с. 9]. Згодна арт. 4 Статута “Аб народных сельскагаспадарчых школах” (далей – Статут), школы дзяліліся на мужчынскія і жаночыя; кіраванне ажыцяўлялася павятовым урадам [5]. Права навучацца ў такіх школах нележала дзяўчатам, якія дасягнулі 14-гадовага ўзросту, а таксама хлопцам з 16-ці год (арт. 6 Статута) [5]. Сам жа курс навучання складаўся з прадметаў, якія непасрэдна былі звязаны з сельскай гаспадаркай: земляробства, жывёлагадоўля,

агароднiцтва, садаводства i г.д. У жаночых школах замест земляробства ў праграму навучання было ўключана дамаводства [4, с. 10–11].

Але нельга казаць, што “санацыйная” ўлада мела мэтай толькi павышэнне адукацыi моладзi. У гэты час II Рэч Паспалiтая з’яўлялася полiэтнiчнай краiнай, аб’яднаўшы палякаў, беларусаў, габрэяў, украiнцаў i iнш. Пры гэтым Ю. Пiлсудкi жыве марай аднавiць Рэч Паспалiтую, якой яна была да трэцяга падзелу 1795 г. Таму школа ў тым лiку, па разуменнi “санацыйнага лагера”, з’яўлялася эфектыўным механiзмам асiмiляцыi, а таксама спрыяла выхаванню ў духу патрыятызму i ўсведамлення неабходнасцi “моцнай” дзяржавы. Афiцыйна гэтая палiтыка мела назву “дзяржаўнай асiмiляцыя” замест “нацыянальнай асiмiляцыi” [4, с. 10]. Пра гэта сведчаць некаторыя мерапрыемствы, якiя праводзiлiся пад час навучання ва ўстановах адукацыi. Так, напрыклад, праводзiлiся “гутаркi на этыка-рэлiгiйныя тэмы”, вывучалася справаводства, польская мова, iшла вайсковая падрыхтоўка i г.д. [6, s. 541]. Па словах мiнiстра рэлiгiйнага выхавання i публiчнай асветы С. Чэрвеньскага, “кожны ўкраiнец, габрэй цi немец, якi нарадзiўся i жыве ў Польшчы, да таго, як стаць свядомым нам работнiкам на нiве культуры сваёй супольнасцi, адчуваў i разумеў, што ён павiнен быць, у першую чаргу, добрым грамадзянiнам Найяснейшай Рэчы Паспалiтай” [7, с. 87]. Гэтая прамова паказвае ў тым лiку стаўленне да беларусаў, якiх нават не ўзгадалi. Вядома, беларусаў-каталiкоў польскi ўрад лiчыў палякамi, а беларусаў, якiя называлi сябе “тутэйшымi”, iмкнулiся асiмiляваць.

Трэба адзначыць, што ва ўмовах санацыйнага рэжыму палiтычная актыўнасць жыхароў Заходняй Беларусi не паменшылася, а нават павялiчылася, бо ў гэты час дзейнiчалi палiтычныя арганiзацыi розных напрамкаў: i левыя, i цэнтрысты, i правыя, а таксама арганiзацыi, якiя прасоўвалi iдэю незалежнасцi беларусаў. Так, напрыклад, як прыхiльнiкi нацыянальна-дэмакратычнага руху вялi сваю дзейнасць такiя палiтычныя арганiзацыi, як Беларуская хрысцiянская дэмакратыя (БХД), Беларускi сялянскi саюз (БСС), iнiцыятарамi якога былi Ф. Ярэмiч i В. Рагуля, “Беларускi фронт” на чале з В. Гадлеўскiм, Праваслаўнае беларускае дэмакратычнае аб’яднанне (ПБДА) [8, с. 109]. Агульнымi тэндэнцыямi для гэтых палiтычных сiл была, па-першае, незалежнасць i аб’яднанне беларускiх зямель i пабудова беларускай дэмакратычнай дзяржавы, прататыпам якой была Беларуская Народная Рэспублiка, абвешчаная 9 сакавiка 1918 г. Па-другое, партыi iмкнулiся вырашыць зямельнае пытанне: лiчылася, што землi неабходна перадаць сялянам без выкупу наогул або без выкупу ў адпаведнасцi з працоўнай нормай. Таксама дзейнасць гэтых партый спрыяла захаванню i развiццю беларускай культуры, мовы, друку i г.д. Так, у вынiку супрацоўнiцтва БХД i БСС быў створаны Беларускi iнстытут гаспадаркi i культуры [8, с. 112]. Пры гэтым фактычна кожная партыя друкавала ўласны часопiс, газету на беларускай мове (“Беларускi фронт”, партыйная газета “Крынiца” i iнш.). Значным бачыцца той факт, што асобным пунктам праграмы БХД было патрабаванне беларусiзацыi. Безумоўна, на тэрыторыi Заходняй Беларусi дзейнiчалi прапольскiя палiтычныя арганiзацыi, якiя ў асноўным фiнансавалiся польскiм урадам, але яны былi непапулярнымi сярод насельнiцтва

і ў хуткім часе сканчвалі сваю дзейнасць (напрыклад, Краёвая сувязь праіснавала толькі да 1922 г.) [8, с. 114].

Падводзячы вынікі выкладзенаму, можна зрабіць наступныя высновы: урад Польшчы на чале з Ю. Пілсудскім у пагоні за аднаўленнем былой Рэчы Паспалітай, магчыма, страціў значна больш, бо эканоміка пасля войн была ў заняпадзе, а на ўсходзе з-за далучэння ваенным шляхам зямель Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны з'явіўся недружалюбны сусед – СССР.

Гаворачы непасрэдна аб санацыйнай палітыцы, трэба сказаць, што гэты рэжым можна параўнаць з праграмай, якую прапаноўваюць палітычныя партыі або кандыдаты ў прэзідэнты. Пэўна, гэтая палітыка была неабходна Другой Рэчы Паспалітай у той момант, бо тады пачыналася пабудова самастойнай дзяржавы ва ўмовах разбуранай эканомікі, сацыяльна стратыфікаванага грамадства і шматэтнічнага насельніцтва.

Што датычыцца пытанняў нацменьшасцяў, то безумоўна былі парушэнні палажэнняў Рыжскага мірнага дагавору. Заходнебеларускія землі ўспрымаліся як сельскагаспадарчы "прыдатак" паколькі асноўную частку насельніцтва складалі жыхары вёсак. З мэтай узняцця эканомікі і паскарэння асіміляцыі "санацыйны" урад пачынае арганізоўваць у нацыянальных рэгіёнах прафесійныя сельскагаспадарчыя школы. Пры гэтым цяжка разважаць аб даступнасці і якасці атрыманых ведаў.

З прычыны таго, што ўрад актыўна праводзіў палітыку паланізацыі і асіміляцыі нацыянальных меньшасцяў, на першы план выходзяць палітычныя партыі, якія імкнуліся да стварэння незалежнай беларускай дзяржавы, а таксама дзейнічалі ў бок захавання культурных асаблівасцей беларускага народа.

У заключэнні хацелася сказаць, што ўвогуле шмат аспектаў гісторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. да сённяшняга дня застаюцца маладаследаванымі, як з пункту гледжання палітыка-прававой арганізацыі грамадства Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, так і з пункту гледжання сацыяльна-эканамічнай пабудовы грамадства.

## Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Задрожна, А. Вялікапольскае паўстаннне [Электронны рэсурс] / А. Задрожна – 2018. – Рэжым доступу : http://archiwum.radyjo.net/4/92/Artykul/398884. – Дата доступа : 26.11.2022.

2. Бардах, Ю. История государства и права Польши / Ю. Бардах, Б. Леснодорский, М. Пиетарчак. – М. : Юрид. лит., 1980. – 564 с.

3. Пилсудский и евреи [Электронны рэсурс] // Заметки по еврейской истории. – 2011. – №6 (141). – Рэжым доступу: https://berkovich-zametki.com/2011/Zametki/Nomer6/Pasika1.php. – Дата доступу: 26.11.2022 г.

4. Кривуть, В. И. Польская молодежная политика на территории Западной Беларуси в межвоенный период / В. И. Кривуть // Журнал российских и восточноевропейских исторических исследований. – 2017. – №1 (8). – С. 8–21.

5. Ustawa z dnia 9 lipca 1920 r. o ludowych szkółach rolniczych // Dziennik Urzędowy Ministerstwa Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego. – 1920. – № 20. – S. 237.
6. Ludowe szkoły rolnicze // Dziennik Urzędowy kuratorjoum okręgu szkolnego Wileńskiego. – 1933. – № 11. – S. 540–541.
7. Rećko, J. Wychowanie dzieci i młodzieży w polityce rządów obozu Jozefa Piłsudskiego / J. Rećko // Marszałek Jozef Piłsudski. Wodz-polityk-wychowawca. Praca zbierowa pod red. dr. W. Ząbka. – Warszawa, 2000. – S. 85–93.
8. Горный, А. С. Белорусские национально-демократические и полонофильские организации в межвоенной Польше / А. С. Горный // Славянский альманах. – 2020. – № 3–4. – С. 106–127.